**Рынкевіч, К.** Герояў не забываюць / К. Рынкевіч // Міёрскій навіны. — 2024. — 17 лют. — С. 1, 5.

## ГЕРОЯЎ НЕ ЗАБЫВАЮЦЬ

**Пётр Брынкевіч, Сяргей Закрэўскі, Уладзімір Мяцеліца, Сяргей Станкевіч, Сяргей Шляпаў. Пяць воінаў-інтэрнацыяналістаў з Міёршчыны, якія назаўсёды засталіся маладымі. Пра іх памятаюць. Напярэдадні 35-й гадавіны вываду савецкіх войск з Афганістана на будынках СШ № 2 імя М. Ізварына і СШ № 3 імя Героя Савецкага Саюза Я. Томкі ўрачыста адкрылі мемарыяльныя дошкі ў гонар былых вучняў, пасмяротна ўзнагароджаных ордэнам Чырвонай Зоркі воінаў Сяргея Закрэўскага і Пятра Брынкевіч.**




Свае 19 гадоў **Сяргей Закрэўскі** сустрэў у ваеннай форме на афганскай зямлі. Праз два тыдні – 25 студзеня 1986-га – яго не стала. Вяртаючыся з баявога задання, група трапіла ў засаду. Бой доўжыўся каля гадзіны. Калі загінуў зампаліт роты, малодшы сяржант Закрэўскі ўзяў камандаванне на сябе. У тым баі абарвалася яго жыццё.

**Пятру Брынкевічу** 19 таксама споўнілася ў Афганістане. 10 сакавіка 1968-га – дзень яго нараджэння, 18 сакавіка 1987-га – дзень гібелі. На вайне міёрскі салдат удзельнічаў у суправаджэнні аўтамабільных калон, якія дастаўлялі ў воінскія часці боепрыпасы і ваенную маёмасць. Аднойчы калона трапіла пад абстрэл варожага гранатамёта. Адна з гранат трапіла ў кабіну машыны, у якой ехаў Пётр.

За кароткімі біяграфічнымі звесткамі, што прыводзілі вядучыя ўрачыстасцяў, – няспраўджаныя мары юнакоў пра будучыню, незагойны боль у сэрцах іх родных і блізкіх, пашана землякоў праз гады.



***Дзмітрый і Святлана Байчукі правялі мерапрыемства ў СШ № 2 імя М. Ізварына***

У Міёрах імёнамі Сяргея Закрэўскага і Пятра Брынкевіча названы вуліцы, ім прысвечаны экспазіцыі ў школьных музеях. Як працяг эстафеты памяці – мемарыяльныя дошкі на сценах іх родных школ.

Урачыстасці сабралі прадстаўнікоў раённай улады, грамадскіх арганізацый, воінаў-інтэрнацыяналістаў, школьнікаў. Сярод удзельнікаў Валерый Баляслававіч Закрэўскі – родны брат загінулага ў Афганістане салдата-міярчаніна.



***Удзельнікі ўрачыстасці ў СШ № 3 імя Героя Савецкага Саюза Я. Томкі.***

Захоўваць і шанаваць памяць пра герояў-землякоў, браць з іх прыклад годнасці і мужнасці наказвалі маладому пакаленню старшыня раённага Савета дэпутатаў **Валерый Драба**, намеснік старшыні райвыканкама **Аляксандр Жук**, кіраўнік раённай арганізацыі ГА «Беларускі саюз ветэранаў вайны ў Афганістане» **Вячаслаў Стома**, воін-інтэрнацыяналіст **Валерый Мажынскі**.

Героі сярод нас. Імі не нараджаюцца. Імі становяцца. Пра іх не забываюць.

**Кацярына РЫНКЕВІЧ.**

**Фотаматэрыял Казіміра БЛАЖЭВІЧА.**

https://mijory.by